ка прытармазіўшы, падкаціўся тралейбус» (М.Лужанін), «Бабка Наста не спала, гаруючы аб Панасе і аб дзеду Талашу» (Я.Колас). У ролі выказніка Д. ўжываецца толькі ў асобных паўн.-зах. і паўн.-ўсх. гаворках: «Нідзе ні бываўшы».

У сказе Д. павінна адносіцца да той самай асобы ці прадмета, што і дзеяслоў-выказнік: «Пад лесам і воддаль ад дарогі вісеў туман, паднявушыся ад зямлі» (І.Пташнікаў). Д. называе ў сказе дзеянне, якое адбываецца адначасова з асноўным (Схіліўшыся ў куточку, стаялі дзве вярбы старыя. Я.Колас), раней за яго (Пад'ехаўшы да школы, Лабановіч выскачыў з драбінак. Я.Колас) або пасля яго (Лясніцкі раздзеўся і лёг, з галавой накрыўшыся коўдрай. М.Зарэцкі). Аднак марфалагічнае значэнне часу ў Д. не выражана: яно перадаецца толькі сэнсам саміх дзеясловаў і Д.

Д. маюць незакончанае і закончанае трыванне: «косячы» — «скасіўшы». Д. незакончанага трывання ўтвараюцца ад асноў дзеясловаў цяперашняга часу пры дапамозе суфікса «-учы (-ючы)» — ад асноў I спражэння і суфікса «-ачы(-ячы)» — ад асноў II спражэння. Напр.: «ідуць — ідучы», «спяваюць — спяваючы», «гавораць — гаворачы», «ходзяць — ходзячы». Д. незакончанага трывання, утвораныя ад зваротных дзеясловаў, маюць часціцу «-ся»: «сустракацца — сустракаюцца — сустракаючыся», «карміцца — кормяцца — кормячыся». Ад некаторых дзеясловаў Д. ўтвараюцца пры дапамозе суфікса «-учы (-ючы)»: «бурчаць — бурчаць — бурчучы»; «вісець — вісяць — вісючы»; «звінець — звіняць — звінючы»; «кішэць — кішаць — кішучы».

Д. закончанага трывання ўтвараюцца ад асновы інфінітыва (або прошлага часу) пры дапамозе суфіксаў «-ўшы» (пасля галосных) і «-шы» (пасля зычных): «сказаць — сказаў — сказаўшы», «збудаваць — збудаваў — збудаваўшы», «несці — нёс — нёсшы», «прывезці — прывёз — прывёзшы». У моўнай практыцы сустракаюцца Д. з суфіксамі «-ўшы», «-шы», утвораныя ад дзеясловаў незакончанага трывання, напр.: «бегчы — бегшы», «быць — быўшы», «мець — меўшы», «касіць — касіўшы» і інш. Аднак такія формы з'яўляюцца парушэннем літ. нормы.

Бел. Д. — гэта амярцвелая кароткая форма назоўнага склону адзіночнага ліку дзеепрыметнікаў цяперашняга або прошлага часу жаночага роду (идучи > ідучы, принесьши > прынёсшы). *І.М.Курловіч.*

**ДЗЕ́ЖКА** Ян (?—1908), беларускі казачнік з в. Новая Хадароўка Сакольскага пав. Гродзенскай губ. Адзін з інфарматараў-выканаўцаў і карэспандэнтаў М.*Федароўскага*, якому паведаміў значную колькасць разнастайных фалькл.-этнаграф. матэрыялаў. Ад Д. запісаны і апублікаваны 19 песень і больш за 70 твораў апавядальных жанраў: казкі пра жывёл, чарадзейныя і сац.-быт., жарты, анекдоты. гіст. і тапанімічныя легенды і паданні. Творы Д. вылучаюцца высокім маст. майстэрствам, дынамічным развіццём сюжэту. Многія запісаныя ад яго творы бел. фальклору папоўнілі тамы серыі «Беларуская народная творчасць».

**ДЗЕ́ЖЫЦ** Валянцін Канстанцінавіч (9.3.1904, Хельсінкі — 29.12.1964), беларускі мастак, педагог. Скончыў Вышэйшы маст.-тэхн. ін-т у Ленінградзе (1930). Выкладаў у Віцебску ў маст. вучылішчы (1931—41), у пед. ін-це (1948—64). Працаваў у станковых графіцы і жывапісе, пераважна ў жанры пейзажа. Сярод работ: «Дэпо», «Сустрэчны» (абедзве 1932), «Аднаўленне моста ў Віцебску» (1935), «Горад зімой» (1937), «Апошнія пешаходы», «Зімовы пейзаж» (абедзве 1946), «9 студзеня» (1947), «Надыход вясны», «Паводка» (абедзве 1956), «На Віцебскай прыстані», «Раніца на Віцьбе» (абедзве 1958), «Адліга», «Сакавік» (абедзве 1960), «Лес — Віцебску» (1961) і інш.

**ДЗЕ́ЙНІК**, у беларускай мове галоўны член двухсастаўнага сказа, які абазначае прадмет думкі, прымета якога сцвярджаецца або адмаўляецца ў *выказніку*. Разам з выказнікам складае прэдыкатыўную аснову двухсастаўнага сказа. Як граматычна незалежны чл. сказа выражаецца толькі пачатковай формай слова: «Павольна спее навальніца сярод засмяглай цішыні» (М.Аўрамчык), «Між лоз купчастых дрэмле срэбны Нёман» (А.Астрэйка). Паводле структуры Д. падзяляюцца на простыя (выражаюцца адным словам з прадметным значэннем, найчасцей — назоўнікам ці займеннікам у форме назоўнага склону), складаныя (выражаюцца разнастайнымі словамі) і састаўныя (спалучэнне інфінітыва з назоўнікамі, прыметнікамі, парадкавым лічэбнікам, займеннікам). У асобных выпадках складаны Д. можа выражацца сказам, пры гэтым ён абазначае адно паняцце, якое характарызуецца выказнікам: «Дзе я чуў гэты выкрык?» — мільгнула ў галаве» (П.Пестрак). Значэнне прадметнасці і сінтаксічную функцыю Д. могуць набываць самаст. і службовыя часціны мовы, а таксама словазлучэнні і сказы. Стыліст. маст.-выяўл. роля Д. як граматычнай катэгорыі звязана з яго здольнасцю указаць як на суб'ект, так і на аб'ект дзеяння ў залежнасці ад тыпу канструкцый. *Т.Ф.Рослік.*

**ДЗЕ́КАННЕ**, фанетычная з'ява, звязаная са змяненнем цвёрдага гука [д] на мяккую афрыкату [дз'] пры яго палаталізацыі, а таксама вымаўленне гэтай афрыкаты. У рознай ступені ўласціва польск., кашубскай, серба-лужыцкай мовам, а таксама асобным дыялектам рус. і славацкай моў. У старабел. мове Д. ўзнікла паміж 14—16 ст. і цяпер з'яўляецца характэрнай асаблівасцю сучасных бел. літ. і дыялектнай моў (за выключэннем зах.-палескіх гаворак): «дні — дзень», «малады — маладзейшы», «два — дзве».

*Літ.*: Крывіцкі А.А., Падлужны А.І. Фанетыка беларускай мовы. Мінск, 1984; Вэкслер П. Гістарычная фаналогія беларускае мовы: пер. з англ. Мінск, 2004. *Д.В.Дзятко.*